# СТРУКТУРНА-СТЫЛІСТЫЧНАЯ РОЛЯ ПЕРЫЯДУ Ў ПАЭЗІІ Р. БАРАДУЛІНА

**Шаршнёва Вольга Мікалаеўна**
загадчык кафедры агульнага і славянскага мовазнаўства
ўстановы адукацыі “Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова”;
кандыдат філалагічных навук, дацэнт
(г. Магілёў, Беларусь)

Зварот навуковых даследаванняў да лінгвістыкі звязнага тэксту тлумачыцца ў першую чаргу імкненнем успрыняць мову як цэласны сродак камунікацыі. Вывучэнне сінтаксічнай структуры макратэксту і асобных яго элементаў (мікратэкстаў) стварае шырокае поле для мэтанакіраванага адбору выразных маўленчых сродкаў і фігур і іх свядомага выкарыстання ў розных кантэкстах. Адной з такіх стылістычных фігур з’яўляецца перыяд.

У лінгвістычнай літаратуры існуюць розныя падыходы пры тлумачэнні перыяду. Пры шырокім падыходзе пад перыядам разумеюць “усялякае складанае сінтаксічнае цэлае…, г. зн. два ці больш самастойныя сказы, аб’яднаныя тоеснасцю тэмы ў сэнсавым блокі” [1, с. 223]. Такое разуменне зыходзіць да ламаносаўскага азначэння перыяду і дазваляе атаясамліваць перыяд са звышфразавым адзінствам, мікратэкстам, празаічнай страфой. Пры вузкім падыходзе да перыяду адносяць спецыфічна арганізаваную сінтаксічную канструкцыю, характарызуючы яе як “моцна развіты просты сказ ці мнагачленны складаны сказ, які характарызуецца з боку зместу значнай паўнатой і закончанасцю выражэння думкі, адзінствам тэмы, а з боку інтанацыі распадзеннем на дзве часткі: павышэнне і паніжэнне” [2, с. 203]. Такое тлума-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

чэнне дазваляе вывесці перыяд за межы складанага сінтаксічнага цэлага, бо прадугледжвае магчымасць не толькі супадаць са складаным сінтаксічным цэлым, але і адпавядаць простаму, моцна развітаму, або складанаму сказу. Стандартная сінтаксічная арганізацыя перыяду ў вузкім яго значэнні арыентуе на 1) дзвюхчастковасць арганізацыі; 2) паслядоўнасць павышэння і паніжэння тону; 3) перавагу аб'ёму павышэння над аб'ёмам паніжэння тону; 4) выкарыстанне анафарычнасці або шматзлучнікавасці (полісіндэтону) ці шматпрыназоўнікавасці пры арганізацыі павышэння (часта ў спалучэнні з сінтаксічным паралелізмам). Ілюстрацыяй класічнага перыяду ў творчасці Р. Барадуліна можа быць наступны тэкст:

*Што ёсць каханне? / Бессаромнасць, / Ці сціпласць, / што не ўздыме воч, / Ці разгаўленне, / Ці скаромнасць, / Ці ў зорках дзень, / Ці ў сонцы ноч? / Ці вечны грэх, / Ці пакаянне, / Ці сум цяжкі, / Ці весялосць? // Пакуль не стоміцца / Пытанне / Пытаць, / Датуль каханне / Ёсць!* ("Што ёсць каханне?").

Дзве структурныя часткі размешчаны паслядоўна, павышэнне суправаджаецца анафарай і сінтаксічным паралелізмам, а лаканічнае паніжэнне сінтэзуе разнароднасць пададзенай інфармацыі, што ў сукупнасці дазваляе сцвярджаць стандартнасць арганізацыі працытаванага перыяду. Класічную дзвюхчастковую арганізацыю маюць наступныя вершы-перыяды Р. Барадуліна: "Адкажы", "Аль-бомнае", "Я стану, як стэп, салёны…", "Я выцісну цябе з сябе…", "Серп і кій", "Дык як?", "Мора", "Чалавек, як і дрэва…", "Паштоўка", "Следам Эклезіяста", "Мусіць!", "Гняздо шэрай чаплі", "У звечарэлай цішыні" і інш. Варта заўважыць, што нават класічна арганізаваны перыяд Р. Барадуліна даволі адметны, спецыфічны, непаўторны. Паэт арыгінальна афармляе павышэнне і паніжэнне перыяду, уводзячы ў іх разнастайныя стылістычныя фігуры выразнасці (паніжэнне ўтварае кальцавую кампазіцыю, што дазваляе аўтару падкрэсліць важнасць, надзённасць, актуальнасць узнятай тэмы ("Няма народаў малых…"); выбірае незвычайную арганізацыю структурных частак (напрыклад, паніжэннем можа быць нават назва верша ("Дровы"), паніжэнне наогул можа мець імпліцытнае выражэнне ("У дужках"), павышэнне арганізуецца з дапамогай не ўласцівых для паэтычнага маўлення рэплік ("Хадакі") і інш.).

Вузкае азначэнне перыяду, з аднаго боку, дазваляе не толькі дэталёва даследаваць сінтэзаваныя з дзвюх частак, сэнсава завершаныя канструкцыі як адзінкі экспрэсіўнага сінтаксісу, але і вызначыць іх стылістычны статус; з другога боку, не выключае магчымасці трансфармацыі перыяду ў складанае сінтаксічнае цэлае або, наадварот, складанага сінтаксічнага цэлага ў перыяд. Праблемным пры такім падыходзе з'яўляецца ўключэнне ў перыяд канструкцый, якія маюць трохчастковую (як складанае сінтаксічнае цэлае) або шматступеньчатую арганізацыю; набліжаных да перарывістага маўлення ана-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

фарычных і эпіфарычных адзінак; арганізаваных па прынцыпе павышэння голасу адначасткавых кампанентаў або кампанентаў, у якіх выдзяленне другой часткі – паніжэння – суб'ектыўнае; канструкцый без анафары ці полісіндэтону як паказчыкаў перыядычнага маўлення і інш.

У лінгвістычнай літаратуры не агаворваецца магчымасць функцыянавання трохчасткавых перыядаў, аднак трансфармаваны трохчасткавы перыяд у творчасці Р. Барадуліна займае значна большае месца, чым класічны двухчасткавы. Прыкладам нетыповай трохчасткавай арганізацыі можа стаць наступны верш:

*І свая ўзважанасць у глыжа, / Сарамлівасць – у апранахі. / І свая ў гэтым свеце мяжа, / Над якой апякуюцца страхі. // Страх рухавы і страх ляны, / Страх абразы і страх пашаны, / Страх нязгоды і страх віны / Перабытаны, перамяшаны. // І свая прыгажосць у смаўжа, / І свая зграбнасць у чарапахі, / І свая немата ў крыжа, / І свая міласэрнасць у плахі...* (“І свая ўзважанасць у глыжа…”).

Прыведзены перыяд можна назваць акальцаваным, але кальцавая кампазіцыя выражаецца не столькі ў змесце, колькі ў форме першай і апошняй страфы, пабудаваных па прынцыпе сінтаксічнага паралелізму. Сама наяўнасць паўтору сведчыць пра важнасць, змястоўнасць, імпліцытнасць пададзенай такім чынам інфармацыі. Такое афармленне накіравана на магчымае супрацоўніцтва з рэцыпіентам: з аднаго боку, тэкст нібы адкрыты для чытача, для папаўнення аўтарскіх перакананняў уласнымі думкамі, разважаннямі, высновамі наконт самых магчымых і немагчымых страхаў, з другога боку, паэт нібы стрымлівае чытача, абазначае мяжу ўяўленняў і фантазій. Працытаваны перыяд нельга размежаваць на дзве часткі. Тут выразна вылучаюцца тры часткі: кароткае паніжэнне акрэслівае тэму выказвання, задае яму тон; аднак павышэнне не мела б поўнага лагічнага завяршэння, калі б не было трэцяй часткі, што дапаўняе, удакладняе зробленую аўтарам выснову, робіць яе больш важкай. На вылучэнне трох частак указвае змена інтанацыі, структурнай і граматычнай арганізацыі, сэнсавай напоўненасці (змена структурных частак у прыведзеным прыкладзе паказана чаргаваннем падкрэсленага і непадкрэсленага курсіўнага шрыфту). Трохчасткавая арганізацыя ўласціва такім вершам-перыядам Р. Барадуліна, як “Кат ці ахвяра”, “Колькі год Беларусі?”, “Закон паэзіі”, “А што я пажадаць маю…”, “Трэба дома бываць часцей…” і інш.

Структура перыяду прадугледжвае павелічэнне сэнсавай нагрузкі на тэкст (мікратэкст) і адначасова павышэнне напружанасці, звязанай з успрыняццем гэтага тэксту (мікратэксту). Перыяд можа ствараць карціну цэлай эпохі, паказваць самыя розныя, нават кантрасныя з'явы ў асацыяцыйнай сувязі, супрацьпастаўляць пачуцці, адчуванні, уражанні, меркаванні. Сістэматызаваць настолькі разнародны матэрыял даволі складана, таму фарміраванне перыядычнага маўлення можа адбывацца ў некалькі этапаў

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

(ступеняў), прычым такі ступеньчаты пераход ад развіцця адной думкі да іншай можа адбывацца ў любой структурнай частцы перыяду. Прааналізуем наступны прыклад:

*1) Трохкутнік / выраю / высока. / Трыпутнік ласкаю прыціх. / Трывога зеўрыцца трохвока. / Век чалавечы, / Як трыпціх. // 2) Світанне. / дзень / і змрок вячэрні. // Іх,трох, / Навечна час упрог. / Трыпціх пасеянага зерня. / Трыпціх – / Дол. / аралля. / нарог. // 3) Трыпціх крыжа, / Трыпціх жагнанняў, / Трыпціх расстайных / Трох дарог. / Трыпціх апошніх / Трох жаданняў. // Трыпціх – / калыска. / кут. / парог…* ("Трыпціх").

Працытаваныя перыяды, па сутнасці, можна было б аднесці да традыцыйных, калі б успрыняцце павышэння і паніжэння было асобным, успрымалася як цэласнае адзінства. Аднак асэнсаванне зместу адбываецца паступова: паніжэнне голасу першага перыяду з'яўляецца адначасова паніжэннем для другога (трохчасткавага) перыяду. Такое афармленне некалькі набліжае перыяды да перарывістага маўлення. Нягледзячы на ўяўную перарывістасць, кожны тэкст мае паказчыкі перыядычнасці: сінтаксічны паралелізм пачатковых радкоў кожнай страфы ў спалучэнні з анафарай, графічнае афармленне. Лесвічнае вылучэнне ў асобны радок элементаў трыпціха стварае ўражанне кальцавой кампазіцыі і эпіфары. Такое афармленне не проста дапамагае сэнсава суаднесці пачатак верша і паніжэнне ўсіх уключаных у яго перыядаў, але і засяродзіць увагу на трох самых важных складніках часу, веры, чалавечага жыцця. На колькасць элементаў павышэння (паніжэння) можа ўказваць, як і ў іншых прыведзеных прыкладах, змена элементаў паралелізму, інтанацыйная аформленасць, адносная закончанасць выражэння думкі (у аналізуемых творах падкрэсленыя канструкцыі з'яўляюцца паніжэннямі ўключаных перыядаў), спецыфіка графічнай арганізацыі.

У паэзіі Р. Барадуліна ёсць вершы, арганізаваныя з асобных класічных перыядаў (мікратэкстаў), але пры гэтым асобныя перыяды выступаюць элементамі павышэння верша-перыяду (макратэксту). Такія вершы ўспрымаюцца як "перыяд у перыядзе" і сведчаць пра высокае майстэрства аўтара, пра яго здольнасць аб'ядноўваць, супастаўляць (або супрацьпастаўляць) і абагульняць самыя нечаканыя з'явы, падзеі, акалічнасці. Прыкладам такой спецыфічнай арганізацыі можа быць наступны верш:

*1) Тым застоллям, / Тым пасцелям – / Дзякуй, // Дзе я гасцяваў, / Дзе начаваў, / Дзе сябе, як дома, пачуваў, / Дзе была падушка дужа мяккай / 2) Дзякуй тым стагам / І тым стажынкам, / Што хмялілі ночы мурагом, / Дзякуй тым снягам / І тым сняжынкам, / Ад якіх святлела ўсё кругом. // 3) Дзякуй / Пакравам, / Дзядам, / Калядам, / Што чакалі з даўнасці мяне, / Ручнікам, / Ад сіверу каляным, / Чэснай крыўдзе / І нязлой мане. // 4) Дзякуй той, / Ад ямін васпаватай, / Сцежцы спорнай у сваёй хадзе, / Што на гэты свет / Вяла з павагай / І на той / Спакойна*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*павядзе. // Не была вада з крыніцы даўкай. / Доля думкі вольнымі пасла. // Загадзя / Зямлі / Кажу я дзякуй. / Баючыся не паспець пасля...* ("Дзякуй...").

Кожная з чатырох строф успрымаецца як асобны класічны перыяд, які мае сваё павышэнне і паніжэнне (паніжэннем у іх выступае слова *дзякуй*), а ўсе яны ў сукупнасці ўтвараюць павышэнне перыяду-верша, паніжэнне ў пацытаваным прыкладзе прапануецца перарывістае: спачатку аўтар выкарыстоўвае імпліцытны прыём тлумачэння сваёй удзячнасці (*Не была вада з крыніцы даўкай. / Доля думкі вольнымі пасла*), затым канкрэтызуе, удакладняе сваё тлумачэнне, нібы баючыся быць не зразуметым (*Загадзя / Зямлі / Кажу я дзякуй, / Баючыся не паспець пасля...*). Як "перыяд у перыядзе" арганізаваны такія вершы Р. Барадуліна, як "Дзякуй Госпаду за дазвол...", "Як захлынуўся ад радасці жаўранак...", "Белая яблыня грому".

Трэба адзначыць, што Р. Барадулін не сканцэнтроўваецца на аднастайных вершаваных формах, нават арганізоўваючы свае творы ў форме перыяду. Ужо кароткі аналіз праілюстраваных перыядаў дае падставы адносіць да іх не толькі класічныя дзвюхчасткавыя канструкцыі, але і аб'яднанні з большай колькасцю структурных элементаў (звычайна гэта перыяды з двайным паніжэннем голасу), а таксама адначасткавыя канструкцыі з выразнымі паказчыкамі павышэння (у такіх перыядах абагульняльная інфармацыя размешчана імпліцытна – у загалоўку, у дужках і інш.).

Перыяд Р. Барадуліна можа не толькі існаваць як самастойны верш, але і быць часткай верша або паэмы. Перыяд, выкарыстаны аўтарам ва ўступнай частцы, прадугледжвае сінтэтычна-аналітычнае развіццё думкі, сэнсава ўзмацняючы такім чынам пачатак верша; перыяд у сярэдняй частцы звяртае ўвагу на сістэмнасць дзеянняў, прыкмет, акалічнасцей, якія прыводзяць да пэўных высноў; перыяд у заключнай частцы верша дапамагае зрабіць выразнае, экспрэсіўнае абагульненне і часта атаясамліваецца з сентэнцыяй. Падабенства да сентэнцыі ўзмацняецца ў выпадку дадатковага эмацыянальнага вылучэння частак перыяду або ўсяго перыяду (пры дапамозе рытарычнага пытання, кальцавой кампазіцыі, эпіфары і г.д.).

Р. Барадулін рэалізуе ў сваіх вершах самыя незвычайныя, адметныя, індывідуальныя формы перыяду, што дазваляе асэнсаваць шматграннасць і разнастайнасць гэтай сінтаксічна-стылістычнай фігуры, успрыняць яе як сродак фарміравання аўтарскага стылю.

**Літаратура**


1. *Кузнецова, А. А.* Период / А. А. Кузнецова // Энциклопедический словарь-справочник: выразительные средства русского языка и речевые ошибки и недочеты / под ред. А. П. Сковородникова. – Москва : Флинта, Наука, 2005. – С. 223–225.
2. *Розенталь, Д. Э.* Словарь-справочник лингвистических терминов / Д. Э. Розенталь, М. А. Теленкова. – Москва : Просвещение, 1985. – 399 с.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова